дэбют



Аляксей Сарока



...у хаце мастака пануе пах
былых вандровак і мінулых спрэчак...

# Пакуль гарбата ў кубку не астыне...

## ТРЫПЦІХ МАСТАКА

*Алесю Пушкіну*

*   *   *

Намалюйце келіх на радне прыгожа
і наліце ў келіх белага віна,
пакладзіце побач хлеба цёплы бохан, —
уздыхне з палёгкай чорная сьцяна.

Запрасіце ў госьці шчырых аднадумцаў,
толькі не лічыце за вакном сьлядоў…
Хай не на падворку, а ў жытле зьбяруцца
–
там, дзе дух ня выстыў
прадзедаў-дзядоў.

*   *   *

Пакуль апоўначы ня спыніцца гадзіньнік,
што сіратліва месьціцца пад стольлю,
пакуль гарбата ў кубку не астыне
і не зьнішчыміцца на жарт адсутнасьць
солі…
За лёс Настаўніка – табе прытулак хіба,
з партрэтам строгім, крыху эпатажным,
дзе цень ад станіка скрозь строі
ледзь заўважны
і тварык кволы пад нябачным німбам.

*   *   *

У хаце мастака пануе пах
былых вандровак і мінулых спрэчак,
і поўня за вакном вісіць, нібы замах
на горшага з тыранаў чалавецтва…

Балада аб Аратым

Забытае неба і сонца з-за кратаў,
дзе вокны на поўдзень, дзе сьцены і
памяць…
І плечы апусьціць стамлёны араты,
калі азірнешся, тады нешта сьцяміш.
Надвор'е спрадвеку — прыдатнай нагодай
сказаць штосьць бяз сэнсу і выпіць бяз сьвята.
А шлюбны пярсьцёнак – ёсьць сімвалам
згоды,
але ён згубіўся ў барознах арната…
Мастак намалюе і пэўна ж ня схібіць —
няхай не калгасьнік, а сумны араты.
Стаіць і ніхто не насьмеліцца выбіць
з-пад ног яго поле, з-за плеч яго хаты.
Ланцуг не парваны, пагрызены толькі,
і прысмак жалеза здаецца гаючым…
Я ведаю, прыйдуць наступныя зоркі,
ты ведаеш – Бог на нябёсах заручыць.
І постаць ля брамы тутэйшага Храму
ня стане маланкай, ці вусьцішным ценем,
а вершнікам збройным і сімвалам Краю
на сьцягу Хрыстовым паўстане праменна.
За вершнікам шчыльна згуртуюцца воі…
Ланцуг не стрымае, ланцуг не закляты.
Вады папрашу, запытаю аб зброі…
Кіўне і на шыхт мне пакажа Араты.

## ДЗЕСЬЦІ НОч…

*Вікторыі Трэнас*

Дзесьці ноч… Мы ня сьпім…
Ты далёка…
Можа, сон… Можа, дым…
Рэха крокаў.
Быццам стомлены мім.
Зьніклі краты…
Мы на кухні сядзім,
п’ем гарбату.

Дзесьці ноч…
Невыразнасьць сьвятла.
І надзейнасьць падлогі.
Постдраўляная сутнасьць стала
сьцеле цень нам пад ногі.

Заўтра зноў пабяжыць
час у дзеях.
Будуць плакаць дажджы
безнадзейна.
Недалёкай царквы
б’юць набаты.
І пакуль што жывы
пах гарбаты.

Дзесьці ноч…
Апраметнасьць вакна.
І раскрыленасьць форткі.
Потым пара разьвеецца на…
Рэха крокаў.

Проста кубкі стаяць.
Проста пара.
Проста трэба спытаць…
Проста мары.
І чаму мы глядзім
так зацята?
Дзесьці ноч… Мы ня сьпім…
П’ем гарбату.